■ Экслібрыс «Звязды»

# АВЕЧКА, ЯКАЯ ХАЦЕЛА СТАЦЬ ЗОРКАЙ

***Наталля БУЧЫНСКАЯ. Незабыўныя сустрэчы з авечкай Адэляй, або Adeljastar@tut.by. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2013. — 166 с.***




Яна дэбютавала на старонках часопіса "Бярозка", спадабалася чытачам газеты "Літаратура і мастацтва", стала "зоркай" літаратурных імпрэз, конкурсаў і прэзентацый і, урэшце, ператварылася ў гераіню выдатна афармленай кнігі для дзяцей. Гаворка ідзе пра незвычайна абаяльную, капрызлівую, далікатную, модную і стылёвую авечку з воўнай рэдкага колеру — белага з блакітным адценнем. Завуць яе Адэля. Яна працуе авечкай на ферме "Каляроўка". Не здзіўляйцеся, гэта не памылка. Адэля сапраўды працуе авечкай. У яе абавязкі ўваходзіць штодзень хадзіць на пашу, скубсці траўку і гадаваць воўну — на радасць прыгажуням. Бо з воўны Адэлі атрымліваюцца незвычайна прыгожыя сукенкі і шалікі.

Але не толькі колер воўны дае дзіцячай пісьменніцы Наталлі Бучынскай нагоду распавядаць пра Адэлю. Справа ў тым, што гэтая авечка — жывёла вельмі амбітная, "натура арыгінальная, самабытная". Ёй не хочацца проста працаваць у "Каляроўцы", яна імкнецца сваю працу выконваць надзвычай якасна, а таксама зрабіць свет вакол сябе крыху лепшым. Так, Адэля змагаецца за чысціню на ферме, піша лісты ў "Грынпіс", збіраецца ў экспедыцыю за палярны круг, наведвае міжнародную выстаўку, а каб быць яшчэ прыгажэйшай, чытае гламурныя часопісы... Увогуле прыгод Адэлі хапае аж на аповесць.

Адметна, што пасля паспяховага літаратурнага дэбюту з урбаністычнай казкай "Прыгоды маленькай Машынкі" Наталля Бучынская вяртаецца ў вёску, прыгадвае маленства, калі заблукала ў жыце, збіраючы васількі, звяртае ўвагу маленькіх чытачоў на свойскіх жывёл, кожная з якіх мае сваё прызначэнне на ферме, а таксама — адметны характар, паводзіны і схільнасці. Натуральна, Адэля — самы яркі персанаж аповесці, сапраўдная яе "зорка".

Але не толькі гераіня робіць кнігу Наталлі Бучынскай значнай. Справа ў адносінах. Пісьменніца (а разам з ёй і гераіня аповесці спадарыня Наталля) ставіцца да авечкі з павагай, яна становіцца сябрам Адэлі, дапамагае ёй — піша кнігу, а таксама дае важныя парады. Калі вясковым жыхарам такое стаўленне да свойскіх жывёл цалкам блізкае і зразумелае, то гараджане ў гэтых адносінах крыху саступаюць. Пісьменніца паказвае, што любімымі могуць быць не толькі бесклапотныя коцікі, сабачкі, хамячкі ці папугайчыкі, але і каровы, коні, козы, авечкі, куры, гусі, качкі... Яны — не цацкі. Яны — жыхары гаспадаркі, якія прыносяць карысць, і таму заслугоўваюць павагі.

Пазіцыя гарадскога жыхара, не знаёмага з жыццём вёскі, выяўляецца ў словах супрацоўніцы пасольства, дзе Адэля, козачка Малімонка і Баранчык атрымліваюць візу, каб паўдзельнічаць у міжнароднай выстаўцы, — "Якое хараство можа быць у гэтых рагатых стварэнняў?" Хараство, можа, не такое зразумелае з першага погляду, але карысць дакладна ёсць. Прыгожая воўна, смачнае і спажыўнае малачко, станоўчыя эмоцыі ад стасункаў з жывёламі.

Як лічыце, ці дасягне Адэля поспеху?

Натуральна, Наталля Бучынская не магла быць жорсткай са сваёй гераіняй, таму сімпатычную авечку чакае міжнароднае прызнанне (яна ўражвае журы і перамагае на выстаўцы), а таксама кантракт з тэлестудыяй. Адэля становіцца вядучай новага тэлешоу, тэма якога — пошукі свайго прызначэння ў жыцці, а героі — жывёлы, што гэтае найвышэйшае прызначэнне шукаюць. Яшчэ раз пацвярджаецца даўно вядомае правіла: калі надта моцна чагосьці хочаш, то абавязкова атрымаеш жаданае. Дарэчы, гэты закон спрацоўвае не толькі ў кнігах, але і ў жыцці.

Варта асобна звярнуць увагу на афармленне выдання. У практыцы выдавецтваў Захаду ўжо стала традыцыяй змяшчаць на вокладцы побач з прозвішчам пісьменніка прозвішча мастака. І гэта цалкам натуральна. У дзіцячых кнігах, дзе патрэбна прыцягнуць увагу яркімі малюнкамі, стварыць запамінальны вобраз, мастак становіцца сапраўдным суаўтарам, дапамагае пісьменніку працаваць з чытачом. У выдавецтвах Беларусі такія крокі пакуль робяцца досыць рэдка. Але, спадзяюся, і мы калі-небудзь да гэтага прыйдзем. Тым больш што мастакі ў нас вартыя ўвагі. Напрыклад, Аляксандра Іванова, якая ў гэтым выданні стварыла яркі і стылёвы імідж авечкі Адэлі і ўсіх яе сяброў.

Дарэчы, Adeljastar@tut.by — гэта сапраўдны электронны адрас, на які можна напісаць ліст і атрымаць адказ ад Адэлі. Хаця б пахваліць яе за тое, што яна надзвычай смелая, настойлівая, карысная і прыгожая.

**Марына ВЕСЯЛУХА** ■

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.46 | 20.42 | 14.56 |
| Віцебск — | 5.31 | 20.36 | 15.05 |
| Магілёў — | 5.36 | 20.32 | 14.56 |
| Гомель — | 5.37 | 20.23 | 14.46 |
| Гродна — | 6.01 | 20.56 | 14.55 |
| Брэст — | 6.07 | 20.52 | 14.45 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 17 жніўня. Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

*Пр.* ПЕРШЫ СПАС (Макавей).
*К.* Сільвіі, Альфрэда, Максіміляна, Яўсея.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ

## ЗАЎТРА




■ Здарэнні

## Прагулкі не атрымалася

**У Старадарожскім раёне шэсць чалавек былі дастаўлены ў бальніцу з-за інцыдэнту, які адбыўся на борце маторнай лодкі: яе пасажыры атрымалі апёкі рознай ступені.**

Як паведалі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, бліжэй да вечара на возера Скачальнае паблізу вёскі Зялёная Дубрава мужчына на асабістым аўтатранспарце прывёз маторку. Праз некалькі гадзін да яго звярнуўся яшчэ адзін мужчына з просьбай пракаціць на лодцы яго самога, а таксама чатырох сваякоў і знаёмых. Калі ўсе яны былі на борце плаўсродку, яго ўласнік паспрабаваў пры дапамозе статара завесці рухавік. Раптам у маторным адсеку пачуўся грукат і адразу шуганула полымя. Усе, хто быў на борце, самастойна пакінулі плаўсродак, балазе маторная лодка знаходзілася ўсяго за метр ад берага. Узгаранне рухавіка і самога плаўсродку не адбылося. У выніку няшчаснага выпадку шэсць чалавек былі дастаўлены ў Старадарожскую цэнтральную раённую бальніцу, пяцёра з якіх атрымалі апёкі рознай ступені.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1385** год — у Крэўскім замку (знаходзіцца на тэрыторыі цяперашняга Смаргонскага раёна) заключана Крэўская унія, дзяржаўны саюз паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай. Крэўская унія — зацвярджэнне вялікім князем літоўскім Ягайлам папярэдне прынятых абавязацельстваў перайсці ў каталіцтва і ахрысціць паводле лацінскага абраду ўсіх язычнікаў-літоўцаў, а таксама стварыць дзяржаўны саюз (унію) ВКЛ і Кароны Польскай. Унію падпісалі Ягайла, князі: Скіргайла (троцкі), Лугвен (мсціслаўскі), Карыбут (ноўгарад-северскі), Вітаўт (троцкі і гродзенскі). Агульным фактарам саюза з'яўлялася барацьба абедзвюх дзяржаў з Тэўтонскім ордэнам. У стварэнні саюза былі зацікаўлены літоўскія і беларускія феадалы, польская знаць, якая жадала спыніць ваенныя канфлікты з ВКЛ з-за Валыні, а таксама каталіцкая царква, якая атрымлівала магчымасць ахрысціць апошні язычніцкі народ у Еўропе. Абедзве дзяржавы аб'ядноўвай адзін манарх, але кожная з іх мела сваю сістэму кіравання, праводзіла самастойную палітыку. 2 лютага 1386 года на з'ездзе польскай шляхты ў Любліне Ягайла абраны каралём Польшчы, праз месяц — каранаваны. Адбывалася паступовае збліжэнне дзяржаўных інстытутаў ВКЛ і Польшчы, а таксама культурнае збліжэнне вярхоў грамадства. Дзякуючы саюзу ўдалося ліквідаваць пагрозу з боку Тэўтонскага ордэна, перамагчы яго ў Грунвальдскай бітве 1410 года, адкрыць гандлёвыя шляхі ў Заходнюю Еўропу. На ўсходзе ВКЛ з дапамогай Польшчы стрымлівала націск Маскоўскай дзяржавы. Вынікамі уніі былі шырокі дыпламатычны выхад ВКЛ у Еўропу, а таксама культурнае збліжэнне з іншымі краінамі Еўропы.



**1867** год — нарадзіўся Джон Галсуорсі, англійскі пісьменнік. Атрымаўшы адукацыю ў Оксфардскім універсітэце, ён стаў адвакатам. Але пасля кругасветнага падарожжа 1891—1893 гг. вырашыў стаць пісьменнікам. У першых творах Галсуорсі, напісаных пад псеўданімам Джон Сінджан, з'явілася сям'я Фарсайтаў. Трылогія "Сага пра Фарсайтаў" зрабіла яго вядучым пісьменнікам у англа-амерыканскай літаратуры. Галсуорсі пакінуў даволі вялікую спадчыну як раманіст, навеліст, драматург і літаратурны крытык. А значную частку сваіх даходаў ён траціў на дабрачыннасць. Нобелеўскую прэмію па літаратуры, атрыманую ў 1932 годзе, Джон Галсуорсі перадаў пісьменніцкай арганізацыі "Міжнародны пен-клуб".

**1944** год — нарадзілася (вёска Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна) Марыя Пятроўна Аношка, беларускі геолаг, геахімік і глебазнаўца, доктар геолага-мінералагічных навук (1999). У 1966 годзе скончыла БДУ. З 1974-га — у Інстытуце геахіміі і геафізікі НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па геахіміі элементаў, ландшафтаў, навакольнага асяроддзя, медыцынскай геахіміі.

Было сказана

*«Як свет стаіць, то яшчэ не было відома, каб на нянавісці вырасла шчасце, а радасць — на чужой бядзе».*
**(Кузьма ЧОРНЫ «Пошукі будучыні».)**

## УСМІХНЕМСЯ

**На першым пасля свайго дня нараджэння ўроку настаўнік працы абвясціў, што паставіць пяцёрку таму, хто будзе пілаваць цішэй за ўсіх...**

Пакінула ноўтбук на падлозе. Бабуля падумала, што гэта вагі. Зрэшты, пяцьсот долараў важыць бабуля.

**Сцвярджэнне, што джэнтльменаў не сустрэнеш у наш час, несправядлівае! Сёння я, напрыклад, бачыў, як мужчына трымаў парасон над жонкай, пакуль тая мяняла ў машыне кола.**

Медыцына XXI стагоддзя: прышываюць адарваныя канечнасці, клануюць органы і г.д., а пластыр, каб нармальна прыліпаў, зрабіць не могуць.

**Вечар. Жанчына звоніць у дзверы суседцы:**

**— Маша, у цябе качалка ёсць?**

**— Не дам! Я свайго сама качаю!**

Муж вяртаецца з рыбалкі цвярозы і з поўным заплечнікам рыбы. Жонка ў шоку:

— Ого! Упершыню такі ўлоў!

Муж, засмучана:

— Кум, мярзотнік, гарэлку дома забыўся...




caricatura.ru

НАРОДЖАНЫЯ 14 ліпеня

**Яны — увасабленне шматаблічнага стану чалавечай душы. Часта займаюць ключавыя грамадскія пасты і амаль заўсёды выконваюць ролю кіраўнікоў або настаўнікаў, хаця па жыцці ім не вельмі цікава кіраваць, дамінаваць і ўладарыць над іншымі. Многія з іх з'яўляюцца ўважлівымі аналітыкамі навакольнага, не ўмеюць утойваць свае асабістыя пачуцці. Ім не заўсёды хапае ўпэўненасці ў сабе, але, тым не менш, яны ідуць у нагу з часам і дасягаюць многага.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 19.878. Індэкс 63850. Зак. № 3350.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 жніўня 2014 года.